# Форум для пажылых грамадзян па скандынаўскай хадзьбе "Крочым разам", прысвечаны 680-годдзю г. Ашмяны і прымеркаваны да Года народнага адзінства

03 верасня 2021 г. у г. Ашмяны на стадыёне па вул. Чкалава адбыўся Форум для пажылых грамадзян па скандынаўскай хадзьбе «Крочым разам», прысвечаны 680-годдзю г. Ашмяны і прымеркаваны да Года народнага адзінства.

Спаборніцтвы праходзілі ў два этапы:

1.Каманднае спаборніцтва, якое прадугледжвае 5 эстафет.

2.Індывідуальныя спаборніцтвы па пераадоленні фіксаванай дыстанцыі.

У камандных спаборніцтвах прынялі ўдзел наведвальнікі аддзяленняў дзённага знаходжання для грамадзян сталага ўзросту цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ашмянскага, Астравецкага і Іўеўскага раёнаў. З неверагоднай лёгкасцю ўдзельнікі форуму выконвалі камандныя заданні, падтрымлівалі адзін аднаго, імкнуліся толькі да перамогі. У выніку пераможцамі сталі ўдзельнікі Астравецкага раёна. Удзельнікі з Ашмянскага і Іўеўскага раёнаў падзялілі другое і трэцяе месца.

Індывідуальныя спаборніцтвы па пераадоленні фіксаванай дыстанцыі паказалі, што пажылыя грамадзяне ў выдатнай спартыўнай форме і з энтузіязмам ідуць да перамогі. Удзельнікі двух этапаў спартыўнага форуму атрымалі граматы, медалі і памятныя прызы.

Адбылося яркае спартыўнае мерапрыемства, якое паказала, што скандынаўская хада-гэта ідэальнае аздараўленне для людзей любога ўзросту, гэта шлях да даўгалецця.









